# ГЕЛЬБЕРГ ЯКАЎ ЛЕЙМАВІЧ: ПЕДАГОГ, НАВУКОВЕЦ, ГЕРОЙ. ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

# A TEACHER, A SCIENTIST, A HERO: YAKOV L. GELBERG (on the occasion of centenary of the birth)

**А.А. Субоцін, В.М. Хаданёнак**
*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт*

**A. Subbotin, V. Khadanionak**
*Vitebsk State Technological University*



У год гістарычнай памяці, які сёлета аб'яўлены ў Рэспубліцы Беларусь, немалаважна будзе ўзгадаць імёны тых, хто зрабіў важкі ўклад у перамогу над фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны, сваім прыкладам выхаваў многія пакаленні нашых грамадзян і перадаў ім свае каштоўныя веды, а таксама заклаў асновы сучаснай сістэмы айчыннай вышэйшай адукацыі. Сярод такіх імёнаў у гісторыі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, бясспрэчна, можна назваць імя Якава Леймавіча Гельберга, якому ў 2022 г. споўнілася б 100 гадоў.

Якаў Леймавіч Гельберг нарадзіўся 16 траўня 1922 года ў невялікім старажытным мястэчку Мена на Чарнігаўшчыне ўсям'і служачых. Яго бацька, Лейма Якаўлевіч, да Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў рахункаводам, а пасля – бугалтарам. Маці, Надзея Ільінішна, працавала рахункаводам. З самага маленства Якаў праяўляў цікаўнасць да кніжак і шмат чытаў на розныя тэмы. У 1930 г. ён пайшоў у першы клас сярэдняй Менаўскай школы, якую выдатна скончыў у 1939 г. Якаў Леймавіч хацеў паступаць у Харкаўскі авіяцыйны інстытут, але лёс склаўся інакш. На адкрытым уроку па гісторыі дырэктар школы быў у захапленні ад адказа Якава, і настойліва парэкамендаваў яму ісці вучыцца ў знакаміты Маскоўскі інстытут філасофіі, літаратуры і гісторыі імя М.Г. Чарнышэўскага. На той перыяд часу гэта вышэйшая навучальная ўстанова мела статус лепшай у галіне грамадскіх навук ва ўсім СССР.

Якаў паслухаў параду дырэктара школы. Нягледзячы на надзвычай высокі конкурс, таленавіты юнак паступіў у МІФЛІ. У гэты час там выкладалі такія вядомыя гісторыкі, філолагі і філосафы, як А.У. Арцыхоўскі, С.Д. Сказкін, М.М. Ціхаміраў, М.М. Пакроўскі, Дз.М. Ушакоў і іншыя. Ужо з першага курса Якаў Леймавіч сур'ёзна заняўся навуковай працай. Пад кіраўніцтвам акадэміка Б.Ф. Поршнева ён пісаў работу "Філасофскія і этычныя погляды Томаса Мюнцэра". Час прадуктыўнай вучобы і творчых пошукаў бязлітасна і раптоўна абарвала вайна. З чэрвеня па жнівень 1941 года Якаў Леймавіч працаваў разнарабочым на заводзе № 24 авіяцыйнай прамысловасці ў Маскве. Ён атрымаў

"бронь" і меў магчымасць застацца на вытворчасці. Але пасля сваіх неаднаразовых хадайніцтваў быў прызваны ў войска.

8 жніўня 1941 г. Гельберг Я.Л. быў накіраваны ў якасці курсанта ў школу сярэдняга каманднага складу пры 15-м запасным артылерыйскім палку 1-й запасной артылерыйскай брыгады, якая базіравалася ў горадзе Каломна. Пасля расфарміравання школы ў кастрычніку 1941 г. ён быў пераведзены курсантам у палкавую школу пры 15-м запасным артылерыйскім палку ў горад Кіраў. У лютым 1942 г. быў прызначаны памочнікам камандзіра ўзвода, а затым камісарам батарэі разведкі вучэбнага дывізіёна.

У канцы сакавіка 1942 г. Якава Леймавіча накіравалі на курсы малодшых лейтэнантаў у горад Горкі (сучасны Ніжні Ноўгарад) пры IV-й запаснай артылерыйскай брыгадзе. Пасля заканчэння курсаў у траўні 1942 г. Я.Л. Гельбергу было прысвоена званне малодшага лейтэнанта, і ён быў адпраўлены на фронт камандзірам агнявога ўзвода ў 53-ці артылерыйскі полк 25-й гвардзейскай стралковай дывізіі, якая фарміравалася ў Калінінскай вобласці. У гэтай дывізіі Я.Л. Гельберг праслужыў да 1946 г., да сваёй дэмабілізацыі.

На працягу вайны Якаву Леймавічу былі прысвоены наступныя званні: гвардыі лейтэнанта, гвардыі старшага лейтэнанта, гвардыі капітана. Таксама ён займаў розныя пасады: намеснік камандзіра батарэі, камандзір артылерыйскай батарэі, начальнік штаба дывізіёна, начальнік разведкі артылерыйскага палка, памочнік начальніка штаба артылерыйскай дывізіі.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны Гельберг Я.Л. ваяваў з ліпеня 1942 г. і прыняў удзел у шэрагу стратэгічных баявых дзеянняў: утрыманне плацдарма на рацэ Дон (паблізу сяла Старажавое Астрагожскага раёна Варонежскай вобласці), фарсіраванне Дняпра, Корсунь-Шаўчэнкаўская і Яса-Кішынёўская ваенныя аперацыі (за ўдзел у апошняй атрымаў ордэн Айчыннай вайны II-й ступені), фарсіраванне ракі Грон (Славакія). Таксама прымаў актыўны ўдзел у вызваленні тэрыторый Беларусі, Украіны, Малдовы, удзельнічаў у баях на тэрыторыі Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі (горад Крэмс), у Чэхаславакіі. У баях пад Кіраваградам (сучасны Крапіўніцкі) быў паранены і цяжка кантужаны.

Найбольш запамінальным эпізодам у сваёй ваеннай біяграфіі Я.Л. Гельберг лічыў бой, за які ён атрымаў свой першы ордэн – ордэн Чырвонай Зоркі. У студзені 1943 г. ішлі ўпартыя баі за станцыю Гаршэчнае (мяжа Варонежскай і Курскай абласцей). Падчас іх Якаў Леймавіч асабіста ліквідаваў нямецкі танк і самаходную ўстаноўку. У ходзе далейшых падзей савецкія войскі былі выбітыя немцамі са станцыі і аказаліся ў акружэнні ў чыстым полі пры 43-градусным марозе. Чырвонаармейцам тэрмінова дапамаглі: скінулі цёплую вопратку і бялізну. Ад камандавання паступіў загад вярнуць станцыю за трое сутак. Для дапамогі было вылучана 12 танкаў, аднак яны былі выведзеныя немцамі са строю. Савецкія воіны былі вымушаны ўступіць у жорсткую рукапашную сутычку з гітлераўцамі і неўзабаве загад быў паспяхова выкананы. Як узгадваў сам Якаў Леймавіч, рукапашны бой тады займаў важнае значэнне і менавіта ён навучыў яго сапраўднай мужнасці.

Я.Л. Гельберг як прафесійны гісторык і педагог змог праявіць свой выкладчыцкі талент нават на фронце. Падчас баёў за плацдарм на рацэ Дон адзін з камандзіраў папрасіў яго падняць баявы дух салдат. Тады Якаў Леймавіч расказаў ім пра прыклады гераічных падзей вайны 1812 г., пра асобу Кутузава і Барадзінскую бітву. Асабліва з расповядаў Гельберга салдат уразілі словы Напалеона пра Барадзінскую бітву: "Французы паказалі, як трэба перамагаць, а рускія, як быць непераможнымі". І хтосьці сказаў: "И сегодня такая же ситуация. Русских победить нельзя. Мы непобедимы".

Важнай падзеяй на франтах Вялікай Айчыннай вайны для Якава Леймавіча стала таксама Будапештская ваенная аперацыя (кастрычнік 1944 – люты 1945 г.). Ажыццявіць штурм Будапешта адначасова з двух бакоў не ўдавалася. Таму камандаванне 2-га Украінскага фронту стварыла будапештскую групіроўку войск, у якую ўвайшла 25-я гвардзейская стралковая дэвізія, у якой служыў Я.Л. Гельберг. 1-га студзеня 1945 г. завязаліся баі ў прадмесці Будапешта. Цяжкасць ба-

явых дзеянняў вызначалася не толькі колькасцю войск і якасцямі тэхнікі праціўніка. Немалаважную ролю мела тое, што штурмавікам удалося стварыць у горадзе моцны вузел супраціўлення і апорныя пункты. Як вядома, Дунай раздзяляе горад на дзве часткі – Буду і Пешт. Масты паміж імі былі зруйнаваны, і важнае значэнне ў забеспячэнні поспеху ўсёй аперацыі набыў захоп вострава Маргітсігет, які быў размешчаны ў цэнтры Дуная. За ўдзел у баях за востраў Якаў Леймавіч быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага. У статусе ордэна сказана: "Ордэнам Аляксандра Неўскага ўзнагароджваюцца камандзіры Чырвонай Арміі, якія праявілі ў баях за Радзіму ў Айчыннай вайне асабістую адвагу, мужнасць і ўмелае камандаванне, забяспечылі паспяховае дзеянне сваіх частак". Афіцэры ўзнагароджваліся гэтым ордэнам вельмі рэдка, выключна за асаблівыя баявыя заслугі.

Вайну Гельберг Я.Л. скончыў у Чэхаславакіі 13 траўня 1945 г., дзе прыняў удзел у канчатковым разгроме нямецкай групіроўкі, якая не жадала дабравольна капітуляваць і здаваць зброю, ірваўшыся на Захад.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Я.Л. Гельберг быў прызначаны на пасаду першага памочніка начальніка штаба 437-й артылерыйскай брыгады 25-й гвардзейскай стралковай дывізіі, дзе і праслужыў да дэмабілізацыі.

У 1946 г. Якаў Леймавіч быў дэмабілізаваны і вярнуўся ў Маскву. Гэта быў ва ўсіх сэнсах цяжкі час. Бацька, маці і бабуля былі забіты фашыстамі ў 1941 г., а брат Лазар загінуў на фронце ў 1944 г. МІФЛІ быў расфарміраваны, а студэнты пераведзены ў Маскоўскі дзяржаўны інстытут. Каб вучыцца пасля вайны, Якаў разгружаў баржы і чысціў дахі дамоў ад снега. Нягледзячы на ўсе выпрабаванні, 30 чэрвеня 1949 г. МДУ быў скончаны з адзнакай, а Я.Л. Гельбергу была прысвоена кваліфікацыя навуковага работніка ў галіне гістарычных навук, выкладчыка вышэйшых навучальных устаноў і званне настаўніка сярэдняй школы.

Па размеркаванні малады спецыяліст адправіўся ў сталіцу Кіргізіі – Бішкек (тагачасны Фрунзэ). Там Якаў Леймавіч працаваў да лютага 1953 года старшым выкладчыкам на кафедры марксізма-ленінізма ў педагагічным інстытуце. Адбыліся прыемныя змены і ў асабістым жыцці. У Бішкеку Я.Л. Гельберг сустрэўся са сваёй будучай жонкай – Верай Мікалаеўнай, ад якой у яго нарадзілася двое сыноў: Сяргей і Аляксандр.

Праца і сямейнае жыццё ўдала спалучаліся з навуковымі пошукамі і адкрыццямі. З лютага 1953 г. па 1955 г. Якаў Леймавіч навучаецца ў аспірантуры МДУ. Аспірантура была скончана датэрмінова і рашэннем аб'яднанага савета гістарычнага і эканамічнага факультэтаў і кафедры марксізма-ленінізма Маскоўскага ўніверсітэта імя Ламаносава ад 28 чэрвеня 1955 г. маладому навукоўцу была прысвоена вучоная ступень кандыдата гістарычных навук.

Трэба было шукаць сталае жыллё, а ў Маскве з гэтым былі пэўныя праблемы. Таму Якаў Леймавіч у верасні 1955 г. разам з сям'ёй пераязджае ў Віцебск, дзе ўладкоўваецца на працу ў Віцебскі ветэрынарны інстытут выкладчыкам сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Ён актыўна піша навуковыя артыкулы і займаецца даследчыцкай работай. Спектр яго зацікаўленасцяў быў вельмі шырокі, ад дзяржаўнага будаўніцтва і пытанняў арганізацыі камуністычнай працы да інтэрнацыянальнага выхавання моладзі і гісторыі прафсаюзнага руху.

12 ліпеня 1961 г. Вышэйшая атэстацыйная камісія прысвойвае Якаву Леймавічу званне дацэнта па кафедры марксізма-ленінізма. А 16 жніўня 1965 г. ён пераходзіць на працу ў толькі што створаны Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці на пасаду загадчыка кафедры марксізма-ленінізма. Прычым зацвярджаў гэтае прызначэнне непасрэдна намеснік міністра адукацыі М. Красоўскі.

Апроч навукова-даследчыцкай дзейнасці Я.Л. Гельберг грунтоўна займаўся і вучэбна-метадычнай і арганізатарска-прапагандысцкай работай. Прычым яе формы часам былі не зусім стандартнымі. Напрыклад, у кабінеце кафедры адзін час была арганізавана "выстава" лепшых канспектаў студэнтаў, што давала ім стымул больш адказна ставіцца да наведвання і канспектавання лекцый. Доўгі час Якаў Леймавіч узначальваў ідэалагічную камісію райкама партыі, кіраваў метадычным саветам

на курсах перападрыхтоўкі партыйных, савецкіх і камсамольскіх кадраў. Вельмі часта ветэран вайны выступаў перад моладдзю, працоўнымі калектывамі горада, у школах і воінскіх частках з лекцыямі, прысвечанымі Вялікай Айчыннай вайне.

Я.Л. Гельберг стаяў і ля вытокаў навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў ВТІЛП па праблемах гуманітарных навук. Так работа студэнтаў А. Казлова, Г. Сіпарава і Н. Арловай "По пути технического прогресса (на примере фабрики КИМ)" пад яго пільным кіраўніцтвам стала лаўрэатам І-га ўсесаюзнага конкурсу навуковых студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук і моладзевага руху. Кафедра марксізма-ленінізма была адзінай у вобласці, дзе былі лаўрэаты і дыпламанты ва ўсіх 5 усесаюзных конкурсах па праблемах грамадскіх навук.

Якаў Леймавіч быў ударнікам 9-й пяцігодкі (1971–1975 гг.). Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 31 жніўня 1976 г. яму было прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка вышэйшай школы БССР. А 21 студзеня 1977 г. Вышэйшая атэстацыйная камісія прысвоіла Я.Л. Гельбергу званне прафесара. 27 год ён кіраваў кафедрай (1965–1992), а затым працаваў у Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце на пасадзе прафесара да 2010 г. За гэты час ён выдаў больш за 100 артыкулаў і 2 манаграфіі (у суаўтарстве).

За сваё доўгае і насычанае жыццё Я.Л. Гельберг быў узнагароджаны 4 баявымі ордэнамі (ордэнам Аляксандра Неўскага, ордэнам Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступені, ордэнам Чырвонай зоркі) і больш за 20 медалямі, а таксама 3 ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Да таго ж ён з'яўляецца ганаровым памежнікам Венгерскай народнай рэспублікі. Апроч афіцыйнага прызнання, Якаў Леймавіч Гельберг назаўжды застанецца ў памяці студэнтаў і супрацоўнікаў Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта як чалавек незвычайнай моцы духа, шчырай душы і вялікага добрага сэрца.